# ЯСКРАВАЕ ДАПАЎНЕННЕ

**У дадатковы — шосты — дзень асноўнай пляцоўкай рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» стала Нацыянальная бібліятэка. Побач з галоўнай кніжнай скарбніцай працавалі інтэрактыўныя зоны, праходзіў канцэрт «Мы разам!». Нягледзячы на моцны пранізлівы вецер, тут было горача: на сцэну, якая размясцілася побач з «храмам кнігі», выходзілі таленавітыя маладыя спевакі і блогеры.**









## СВЯТА ДЛЯ МОЛАДЗІ

Было адчуванне, што на сустрэчу з кумірамі з'ехаліся маладыя фанаты з усяго Мінска. Хлопцы і дзяўчаты спявалі разам з любімымі выканаўцамі, рабілі сэлфі і відэа з канцэрта.

З раніцы быў запушчаны квэст «Гэта ўсё маё роднае», калі каманды ў 5—10 чалавек павінны былі за кароткі час паспець прайсці некалькі станцый з падрыхтаванымі для іх пытаннямі па культуры, гісторыі, літаратуры, расказаць альбо даведацца пра дасягненні нашай краіны, выканаць танцавальныя і песенныя заданні. За дзень квэст прайшлі 179 каманд (каля дзвюх тысяч чалавек). Як расказалі валанцёры — а квэст праводзілі студэнты розных ВНУ сталіцы, — да пазнавальнай гульні далучаліся школьнікі, навучэнцы, працоўная моладзь, сем'і. Самаму юнаму ўдзельніку было каля шасці гадоў, а старэйшаму — за семдзесят. «Цудоўна, што марафон аб'ядноўвае ўсе пакаленні. Нам жа, валанцёрам, вельмі цікава было працаваць з людзьмі. Яны зараджалі пазітывам, казалі, што нас любяць», — падзялілася ўражаннямі **сакратар пярвічнай арганізацыі БРСМ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры Таццяна КАНАНОВІЧ**.

## ФІНАЛЬНЫ ФЛЭШ-МОБ

Удзельнікі яго сабраліся каля Нацыянальнай бібліятэкі, каб выканаць гімн Рэспублікі Беларусь. Разам паспяваць прыехалі прадстаўнікі навучальных устаноў, прадпрыемстваў, арганізацый. Да вялікага хору, які пачаў збірацца на прыступках Нацыянальнай бібліятэкі, далучыліся арганізатары мерапрыемства, валанцёры, блогеры і шматлікія госці.

Сярод удзельнікаў флэш-мобу былі і прадстаўнікі ваенна-патрыятычнага клуба «Арляняты. Нашчадкі Перамогі» пры сярэдняй школе № 72. Паліна Генчык расказала, што іх аб'яднанне створана, каб шанаваць традыцыі, а галоўная яго мэта — не дапусціць таго, каб гісторыя і подзвіг народа былі забытымі. Дзяўчына заўважыла, што «Марафон адзінства» аб'ядноўвае людзей, даносіць важныя ідэі, расказвае пра гісторыю, падтрымлівае таленты.

Вучні сярэдняй школы № 15 прыехалі на марафон разам з кіраўніком па ваенна-патрыятычным выхаванні Аляксандрам Іваненкам. Школьнікі далучыліся да конкурсаў, пазнаёміліся з выстаўкай рарытэтных плакатаў. Настаўнік заўважыў, што акцыя дае магчымасць моладзі лепш пазнаёміцца са сваёй краінай, даведацца пра яе дасягненні.

**Ганна ПЯТРОВА.**

Ганна ЛУКАШЭНКА:

# «НАМ ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА»

**«З сумам і адначасова з радасцю падводзім вынікі, бо мы рэалізавалі ўсё, што было запланавана, і нават больш», — падзялілася ўражаннямі кіраўнік рабочай групы па арганізацыі «Марафону адзінства» Ганна ЛУКАШЭНКА.**



У рамках марафону прайшлі сотні акцый і мерапрыемстваў у розных гарадах краіны, толькі ў Мінску іх было каля сямідзесяці.

Ганна Лукашэнка расказала, што з самага пачатку задумвалася маштабная рэспубліканская акцыя, але арганізатары не маглі ўявіць, наколькі ўжо ў працэсе яна будзе пашырацца, напаўняцца новымі мерапрыемствамі: «Марафон цікавы тым, што атрымаўся жывым арганізмам, ён пастаянна прырастаў ідэямі». Так, ідэя акцыі «Адну справу робім» належыць калектыву Беларускага металургічнага завода. Пасля супрацоўніца Магілёўскага завода ліфтавага машынабудавання напісала песню, якая стала джынглам для акцыі. Праект «Маё жыццё. Мой шлях. Мой Прэзідэнт», у рамках якога былыя дзяржслужачыя дзяліцца сваім вопытам, прыдуманы дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Вадзімам Гігіным. Спецыяльна для марафону былі распрацаваныя новыя мерапрыемствы, выстаўкі. Многія з іх маглі б развівацца ў далейшым як самастойныя праекты. Удзельнікі набылі ўнікальны вопыт. Такім чынам, супрацоўнікі Вялікага тэатра выйшлі за сцэны сваёй установы: вывозілі касцюмы, рэквізіт, у розных гарадах расказвалі пра творчасць. Ужо паступіў запыт на тое, каб некаторыя выстаўкі, створаныя для марафону, былі працягнуты.

Калі спачатку здавалася, што ўсюды марафон пройдзе па стандартнай праграме, то ўжо пасля акцыі ў першым горадзе канцэпцыя была зменена, пад кожны населены пункт ствараўся індывідуальны план, каб паказаць яго ўнікальнасць. Многія акцыі дабаўляліся, як кажуць, «з калёс». Так, калі каманда арганізатараў марафону прыбыла ў Наваполацк, там паведамілі, што на гарадской плошчы пройдзе выстаўка тэхнікі, і ў праграму дадалася новая акцыя — «Гэта мая краіна».

Падчас марафону праходзілі сустрэчы і канцэрты на прадпрыемствах, наведваліся знакавыя мясціны, адбываліся знаёмствы з цікавымі людзьмі. А галоўнае, што гэта інфармацыя транслiравалася на ўсю краіну. «Такім чынам, мы рабілі вялікую агульную справу па яднанні людзей. А яшчэ гэта задзел на будучыню. Марафон паказаў, што самы час нам, беларусам, пачаць любіць сваё. Нам ёсць чым ганарыцца: людзьмі, прадукцыяй, нашай краінай», — заўважыла Ганна Лукашэнка.